ВЫТОКІ

# Аб'ект даследавання — скарбы

**Гістарычныя знаходкі і іх галоўныя перліны сталі галоўнай тэмай для абмеркавання падчас XVI Гарадзенскіх навуковых чытанняў «Скарбы гарадзенскіх калекцый», якія прайшлі ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага.**

Галоўны бібліёграф сектара фарміравання інфармацыйнай прадукцыі навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі інфармацыйнага цэнтра Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Наталля Барсукова пазнаёміла прысутных з інфармацыяй пра збіральнікаў і калекцыянераў Гродзеншчыны ў анлайн-энцыклапедыі «Беларусь у асобах і падзеях».

Магістр гістарычных навук Андрэй Грэсь падзяліўся асабістымі высновамі пра медалі з каралеўскай серыі часоў Станіслава Аўгуста Панятоўскага, якія з'яўляюцца часткай фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. З друкаванымі выданнямі на мове ідыш з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі пазнаёміў Андрэй Ціхаміраў.

Паводле слоў дырэктара Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага Марыны Ігнатовіч, сёлета шмат увагі ўдзяляецца дзейнасці маладых даследчыкаў. У навуковых чытаннях бралі ўдзел студэнты ды аспіранты ВНУ. Так, студэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Мікіта Каспер абраў тэмай выступлення гісторыю фарміравання астэалагічнай калекцыі сваёй установы адукацыі, а пра сёлетнія вынікі археалагічных работ у мікрараёне Кульбакі Гродзенскага раёна распавялі аспірант Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, навуковы супрацоўнік музея гісторыі рэлігіі Аляксандр Гаршкоў і студэнт Гродзенскага ўніверсітэта Павел Жабінскі.

Пра керамічныя скарбонкі і манеты распавёў Віктар Какарэка, калекцыянер, старшыня Беларускага нумізматычнага таварыства. Хатнюю кніжніцу як катэгорыю калекцыяніравання разгледзеў кандыдат філалагічных навук, прафесар Аляксей Пяткевіч. Размова таксама ішла пра мастацкую калекцыю і бібліятэку Аляксандра Гінтаўта, правененцыі на кнігах з бібліятэкі Масалянскай ардынацыі і гісторыка-археалагічнай часткі краязнаўчай экспазіцыі Гродзенскага абласнога цэнтра турызму і краязнаўства.

Падчас мерапрыемства таксама падкрэслілі вялікую навуковую дзейнасць Гродзенскай абласной бібліятэкі і абралі тэму для абмеркавання на XVII Гарадзенскіх навуковых чытаннях.

**Таццяна БАБКО**